7. ГБУ «ЦГА Москвы». – Ф. 318. Оп. 2. Т. 1. Д. 3651.
8. ГБУ «ЦГА Москвы». – Ф. 318. Оп. 2. Т. 1. Д. 3651.

УДК 821.161.3 (075.8)

*С. Э. Сомаў*

# АБ'ЕКТЫЎНЫЯ І СУБ'ЕКТЫЎНЫЯ АБСТАВІНЫ ЎСТУПЛЕННЯ ГЕОРГІЯ КАНІСКАГА НА МАГІЛЁЎСКУЮ ЕПІСКАПСКУЮ КАФЕДРУ

**Анатацыя.** Аналізуюцца аб'ектыўна-гістарычныя і суб'ектыўныя духоўна-псіхалагічныя абставіны ўступлення архімандрыта Кіева-Брацкага вучылішчнага манастыра, рэктара Кіева-Магілянскай акадэміі Георгія Каніскага на пасаду біскупа Магілёўскага і Беларускага (1755–1795) у складаны перыяд рэлігійнага супрацьстаяння і абвастрэння пытання аб правах дысідэнтаў у Рэчы Паспалітай.

**Ключавыя словы**: Георгій Каніскі, Магілёў, епіскапская кафедра, перакананні, служэнне, пакорлівасць, воля, духоўны подзвіг.

Служэнне архіепіскапа Георгія Каніскага на Магілёўскай архірэйскай кафедры ўяўляе сабой цэлую эпоху ў развіцці Праваслаўнай царквы на беларускіх землях. За сорак гадоў знаходжання на пасадзе Магілёўскага епіскапа, а затым архіепіскапа, з 1745 г. па 1795 г., Каніскаму давялося перажыць цяжкія ганенні з боку прадстаўнікоў іншых канфесій, якія дамінавалі ў Рэчы Паспалітай (каталікоў і ўніятаў), фактычна ўзначаліць рух польскіх дысідэнтаў за свабоду сумлення, адраджаць на Магілёўшчыне праваслаўнае рэлігійнае жыццё пад заступніцтвам Расійскай імперыі пасля першага падзелу Польшчы 1772 г., паклаўшы пачатак найсур'ёзнейшаму па сваіх маштабах і наступствах працэсу ўз'яднання ўніятаў, які быў скончаны мітрапалітам Іосіфам Сямашкам толькі ў 1839 г. на Полацкім саборы.

Аб'ектыўныя гістарычныя абставіны ўступлення Георгія на Магілёўскую кафедру вывучаны ў дастатковай ступені і не ўяўляюць сабой актуальнай навуковай праблемы, паколькі сярэдзіна XVIII ст. у еўрапейскай гісторыі – гэта перыяд добра дакументаваны і глыбока вывучаны (цяпер мы можам гаварыць аб працэсе дэталізацыі і інтэрпрэтацыі падзей таго часу з пункту гледжання пэўнай філасофіі гісторыі). Напрыклад, добры аналіз сітуацыі, якая склалася ў Магілёўска-Беларускай епархіі да часу прыезду сюды Каніскага, прадстаўлены ў кнізе Міхаіла Буглакова «Преосвященный Георгий Конисский, Архиепископ Могилевский», якая з'яўляецца на сённяшні дзень самым поўным біяграфічным апісаннем жыцця і дзейнасці беларускага асветніка [1, с. 18–59].

Відавочным фактам для даследчыкаў і, што важна, для самога Каніскага была тая акалічнасць, што Магілёўская епархія знаходзілася ў цяжкім стане як

у адміністрацыйна-фінансавых, так і ў духоўна-рэлігійных адносінах. Гэта была адзіная праваслаўная епархія на тэрыторыі беларускіх земляў, яшчэ не скасаваная і не пераведзеная на ўнію. Безумоўна, наяўнасць гэтай апошняй апоры, па словах каталікоў, «халопскай» або «схізматычнай» веры выклікала моцнае раздражненне, а епархія падвяргалася нападкам, змяншалася ў колькасных (дзясяткі храмаў і манастыроў пераводзіліся на ўнію) і ў якасных (поўная адсутнасць семінарый для падрыхтоўкі клірыкаў) адносінах. Таму не выпадкова, аналізуючы дакументы таго часу, галоўным чынам рапарты і данясенні ў Сінод Рускай царквы архірэяў-папярэднікаў Каніскага, М. Буглакоў робіць выснову, што «епархия находилась на краю гибели» [1, с. 47].

Сапраўды, і Сільвестр II Чацвярцінскі, і Арсеній Берло, і Іосіф IV Ваўчанскі, і яго брат Геранім Ваўчанскі пісалі пра гвалтоўнае адабранне цэркваў і манастыроў на ўнію (толькі пры Іосіфе іх было забрана 128), слёзна малілі аб дапамозе, аб выплаце належнага грашовага ўтрымання Магілёўскай епархіі, але, па вялікім рахунку, нічога не атрымлівалі, паколькі епархія знаходзілася на тэрыторыі іншай дзяржавы і нават дастаўка з Расійскай імперыі грошай уяўляла сабой сур'ёзную цяжкавырашальную задачу, якую ні царкоўныя, ні свецкія чыноўнікі не імкнуліся вырашаць (дарэчы, яе зможа вырашыць толькі Георгій Каніскі, які пазней даб'ецца не толькі выплаты ўсіх грошай за многія гады, але і ўзброенай аховы для дастаўкі абозу са срэбрам у Магілёў).

Сітуацыя напярэдадні архіерэйскай хіратоніі і прызначэння Георгія ў Магілёў была тут настолькі цяжкай, што Геранім Ваўчанскі прама пісаў у Сінод наступнае: «… епархия сия от супротивных разорена,.. ниже монастыря кафедрального, ниже дому архиерейского, певчих, людей потребных и духовной консистории и канцелярии ничем содержать невозможно, також сгорелой кафедры на строение потребное откуду взять кошту не имеется» [1, с. 57]. Епіскап ужо знаходзіўся на мяжы псіхалагічнай гатоўнасці таксама перайсці ва ўніяцтва, каб спыніць нарэшце свае асабістыя пакуты (на яго аказваўся ціск нават у выглядзе замаху на жыццё) і пакуты сваёй паствы. Ён прасіўся на спакой, куды-небудзь у манастыр, «у келію», інакш за сябе не ручаўся: «Буде же ни, – пісаў епіскап Іеранім, – то и сам принужден буду уступить, понеже уж и последнее здравие потерял, не имея ниже сам чем более жить, ниже людей потребных к помоществованию содержать и откуда оных взять.. Бог весть, что впредь сделается со мною и с сею бедною епархиею» [1, с. 58].

Пакуты Гераніма скончыліся з яго смерцю ў кастрычніку 1754 г., а выбар Сінодам новага кандыдата ў Магілёўскія епіскапы выпаў на Георгія Каніскага, які ў той перыяд з'яўляўся архімандрытам Кіева-Брацкага вучылішчага манастыра і рэктарам Кіева-Магілянскай акадэміі. Паводле слоў М. Буглакова, «вопрос о проставлении епископа в Могилевскую епархию все более осложнялся, превращаясь из вопроса естественной замены умершего епископа новым в вопрос более высокого значения – дальнейшего существования самой Белорусской епархии» [1, с. 97]. Без сумневу, Георгій як адукаваны чалавек і

высокапастаўлены клірык не мог не разумець гэтага, як і ўсведамляць цяжар таго становішча, у якім знаходзіцца беларускае праваслаўе, паколькі праблемы каталіцка-ўніяцкага празелітызму на ўкраінскіх землях стаялі таксама востра, як і на беларускіх.

Тым важнейшымі і цікавейшымі для нас з’яўляюцца суб'ектыўныя абставіны перамяшчэння Каніскага з Кіева ў Магілёў, паколькі іх разуменне дазваляе больш глыбока апісаць асобу гэтага выдатнага гістарычнага дзеяча, які праявіў сябе ў шэрагу выключных здзяйсненняў і ў мностве тэкстаў навуковага, аратарскага і мастацкага характару. Сам факт пераезду з шчаслівага Кіева архімандрыта, прафесара, рэктара, чальца кансісторыі на спустошаную Магілёўскую кафедру, хай нават у прывабнай якасці епіскапа, з'яўляецца прыкладам духоўнай крэпасці і асабістага подзвігу Каніскага, паколькі ў Магілёве яго чакала перспектыва страт, ганенняў і нават фізічнага знішчэння (якая потым сапраўды выявілася ў шэрагу замахаў на жыццё Георгія).

Прычыны бачацца ў выдатных асабістых якасцях Каніскага, сфарміраваных у дзяцінстве і юнацтве, а таксама ў яго перакананнях, перш за ўсё рэлігійных, і высокім узроўні адукацыі: ён з адзнакай скончыў поўны пятнаццацігадовы курс навучання ў Кіеўскай акадэміі, а затым дзесяць гадоў выкладаў на кафедрах красамоўства, філасофіі і багаслоўя.

Рашэнне прыняць Магілёўскую кафедру выяўляе наяўнасць у душы Георгія спецыфічнага злучэння манаскай пакоры перад воляй Маці-Царквы, за якой для артадаксальна веруючага чалавека стаіць воля Госпада Бога, з падзвіжніцкай гатоўнасцю прыняць любыя выпрабаванні на ахвярным шляху да галоўнай жыццёвай мэты – да выратавання асабістай несмяротнай душы. Гэтая рашучасць была выказана Каніскім яшчэ 11 жніўня 1744 г., у дзень яго манаскага пострыгу ў Кіева-Пячэрскай лаўры, калі ён звярнуўся да брацііі з пропаведдзю пра абраны ім шлях следавання за Хрыстом: «… Приметим, – гаварыў наваначальны інак, – куда сей путь лежит? – Воистину, прямо чрез Голгофу; си есть за Христом идущий не минет Голгофы страдания, найдет на коемждо поприще крестовидные столпы; треба ступать на гвоздие и на терние, не пяты только, но и главу будущее и до мозгу пронзающее; треба пройти сквозь огонь и воду; треба вдатися на мечи и на копья, на челюсти зверей и змиев, вменитися за овцу заколения ...» [1, с. 66].

З 1744 г. па 1746 г. Георгій працуе на пасадзе прапаведніка Кіева-Пячэрскай Лаўры, дзе пачаў адточвацца яго талент прамоўцы, здольнага даносіць Евангельскае слова да слухачоў, дастукацца да самых скамянелых сэрцаў, натхніць, заклікаць іншых да падзвіжніцтва, да следавання на Галгофу, куды ён свядома ішоў сам. Прапаведніцкую дзейнасць у далейшым ён працягваў на Магілёўскай кафедры, звяртаючыся са словамі падбадзёрвання і натхнення да новай для яго беларускай паствы. Пра яго суб'ектыўнае стаўленне да ашаламляльных змен у жыцці, да змены царкоўнага статуту і новага няпростага служэння можна меркаваць па змесце першай пропаведзі Георгія ў

Магілёве, якую ён вымавіў з амбона старажытнай Богаяўленскай царквы Брацкага манастыра 26 кастрычніка 1755 г. адразу па прыездзе з Кіева.

«Слова пры ўступленні на паству» носіць для архірэйскай дзейнасці і творчасці Каніскага праграмны характар і ў ідэйных, і ў мастацка-стылявых адносінах [2, с. 53–59]. Георгій прысвячае Слова аповеду «пра сябе самога» ў аспекце свайго погляду на сутнасць «пасады» біскупа, на тыя галоўныя мэты і задачы, якія стаяць перад ім.

Для Каніскага «епископ есть учитель-проповедник», і гэтую думку ён даказвае на прыкладзе вобразаў і постацей Святога Пісання і Святога Падання. Найбольш поўнае ўвасабленне сапраўднага біскупства прапаведнік бачыць у асобах Айцоў Царквы першых стагоддзяў хрысціянства: Афанасія Вялікага, Васіля Вялікага, Іаана Залатавустага, Кірыла, Рыгора, Феадарыта, Амбросія, Аўгустына і інш., якіх называе «столпами веры, утверждением истины, поборниками благочестия», вартавымі, якія ратавалі царкву ад ерасяў і расколаў. Мову і пяро праўдзівага епіскапа Каніскі параўноўвае з «перуном», маланкай, якая раскідвае «плевелы и нечестие» (Афанасій і ерась Арыя), са зброяй больш грознай, чым воінская (Васіль і Юльян адступнік), са святлом, ззяючым ярчэй за нябеснае сонца (Іаан) [2, с. 55–56]. Пры гэтым архірэй шкадуе аб цяжкасці ўскладзенай на яго адказнасці, засмучаецца ад думак аб магчымым пакаранні, баіцца суда, на якім Пазоўнікам і Суддзёй выступае Сам Творца, і хацеў бы «ўцячы» ад гэтага высокага звання, але падкрэслівае, што ад волі Творцы ніхто не можа схавацца нават на дне марскім (вобраз Іоны ва ўлонні кіта), а таму зміраецца і заключае: «Убо якоже изволися Господеви, тако и мне да будет!» [2, с. 58].

Гэтая першая пропаведзь Георгія ў Магілёве выявіла перад паствай асаблівую высакароднасць жыццёвых ідэалаў святцеля. Ніводным словам Каніскі не агаворваецца пра найскладанейшую царкоўную і палітычную сітуацыю, паколькі галоўнай для яго застаецца толькі адна праблема – духоўна-маральны стан чалавека. Гэтая дзіўная вышыня асветніцкіх памкненняў Каніскага, злучаная з глыбокай верай і непахіснай воляй, пасля была рэалізавана ў яго саракагадовым адданым служэнні беларускаму народу, што набыло яму не толькі славу прапаведніка, але і вянок хрысціянскай святасці (кананізаваны ў 2003 г.).

## СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. **Буглаков, М.** Преосвященный Георгий Конисский, Архиепископ Могилевский / М. Буглаков. – Минск : Виноград, 2000. – 656 с.

2. Слова и речи Георгия Конисского, Архиепископа Могилевского. – Могилев-на-Днепре: Скоропечатня и Литография Я. Н. Подземского, 1892. – 469 с.